# Прэзідэнт павіншаваў М.Дземянцея

***У сувязі са знамянальнай датай — 70-годдзем з дня нараджэння — Прэзідэнт А.Р.Лукашэнка павіншаваў члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М.І.Дземянцея.***

У віншаванні адзначаецца, што М.І.Дземянцей добра вядомы ў рэспубліцы як буйны дзяржаўны і палітычны дзеяч, які аддаў шмат сіл, вопыту і ведаў развіццю і ўмацаванню роднай Беларусі. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам закладваліся і фарміраваліся асновы беларускай дзяржаўнасці.

"Маючы вялікі жыццёвы вопыт і глыбокія веды, Вы і сёння арыентуеце дзейнасць маладых палітыкаў і парламентарыяў на будучыню, стараючыся нічога не страціць з таго добрага і разумнага, што створана ў рэспубліцы ў мінулыя гады", гаворыцца ў віншаванні.

У дзень юбілею Прэзідэнт ад усёй душы пажадаў М.І.Дземянцею моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.